на і яго эпоха; пад рэд. В А. Чамярыцкага – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 280 с.
14. Эйке из Репкова Саксонское зерцало. В 2-х ч. Ч. 1: Земское право. В 3-х книгах Кн. 1 / пер. Л.И. Дембо. – М.: Наука, 1985. – [Эл. ресурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Germany/XIII/Sachsenspiegel/_frametext1.htm. – Дата доступа: 08.01.2007
15. Kuchowicz Z. Barbara Radziwiłłówna. – Łódz: Wydaw. Łodzkie, 1976.

**С.У. Андрыеўская**
*(Наваполацк)*

## МІЖЭТНІЧНЫЯ ЎПЛЫВЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ЦАЦЦЫ

Этнічная культура беларусаў – з'ява багатая і самабытная. Яна мае шэраг дрэнна даследаваных феноменаў. Беларуская народная цацка – адзін з іх. Сціплая, з густам аформленая, традыцыйная па сюжэтах і колерах беларуская народная цацка стала візітнай карткай кірмашоў у кан. XIX – пач. XX ст. У XX ст. яна ператварылася ў музейны экспанат, тым не менш, па-ранейшаму з'яўлялася адной з візітных картак беларускай культуры. Паколькі культура кожнага народа развіваецца ва ўзаемасувязі з культурамі суседніх народаў, міжкультурныя стасункі можна прасачыць ва ўсіх з'явах. На народнае мастацтва беларусаў моцна ўплывалі дасягненні ўсходніх і заходніх славян, народаў Прыбалтыкі і Заходняй Еўропы. Узаемаўплывы праявіліся і ў народнай цаццы.

Народнае мастацтва беларусаў доўгі час захоўвала архаічныя рысы і перажыткі. Існаванне розных стылістычных накірункаў характэрна для беларускай народнай цацкі як з'явы народнага мастацтва. Народная цацка вядзе сваю гісторыю ад скульптурных выяў людзей і жывёл, вядомых з часоў палеаліту. Цацкі з розных матэрыялаў сустракаюцца пры раскопах сярэднявечных гарадоў. Яны вызначаюцца абагульненасцю форм і вобразаў, створаных найпрасцейшымі прыёмамі лепкі. У XVI – XVII стст. сярод знаходак сустракаюцца вырабы, упрыгожаныя зялёнай, карычневай, празрыстай палівай. Свайго росквіту мастацтва цацкі дасягнула ў XIX – першай палове XX ст. [1, с. 387].

Блізкія стасункі ўсходнеславянскіх народаў тлумачаць падабенства цацак і іншых прадметаў народнага мастацтва. Старажытныя ўзоры цацак падобны, незалежна ад таго, дзе яны знойдзены – у Ваўкавыску, Гродна, Вялікім Ноўгарадзе, Кіеве ці Кракаве. Сюжэты цацак ва ўсіх славянскіх народаў аднолькавыя (гэта выявы звяроў і людзей).

Матыў каня і конніка ў цаццы вядомы на абшарах усёй Еўропы. Конь – старажытны індаеўрапейскі сімвал, таму ён вядомы і ва ўсіх славянскіх народаў. У палякаў на веснавых аграрных святах Рэнкаўкі і Эмаўса (г. Кракаў, Польшча) сярод іншых цацак прадавалі і конікаў. Выраб фігурак хатніх жывёл трактуецца як спроба паўплываць на дабрабыт, а продаж вялікай колькасці цацачных жывёл павінен падштурхнуць плодныя сілы прыроды ў адносінах да сапраўднай жывёлы. Падобная логіка была і ў продкаў беларусаў. Выраб цацачных жывёлак беларускімі майстрамі адбываўся круглы год, але асабліва актыўна іх рабілі з нагоды кірмашоў і святаў, асабліва веснавых. Паходжанне звычая сягае ў часы ахвярапрынашэнняў. Звязаны выраб фігурак з паступовай заменай сапраўднай жывёлы на сімвалічную ахвяру. Даследчык народнай культуры і народнай цацкі Л.А. Дзінцэс выказаў меркаванне, што "гэта выявы дробных боостваў, сімвалізуючых з'явы прыроды, падобна Калядзе, які паводле беларускай міфалогіі ездзіць на белым кані, конь з'яўляецца і атрыбутам святога Юрыя" [2, с. 71]. Сюжэт барацьбы святога Георгія (Ягорыя, Юрыя) са змеем пашыраны ў культуры індаеўрапейскіх хрысціянскіх народаў, знайшоў увасабленне ў розных песенных і празаічных жанрах (візантыйскія легенды, усходнеславянскія духоўныя вершы, беларуская балада, паўднёваславянскія "мітчні", "епіческі", "релігіозні-легендарні", "коледні песні" і інш.). Відавочна, хрысціянская традыцыя наклалася на старажытную міфічную глебу [3, с. 106-107]. Вобраз бога на кані застаўся ў народнай традыцыі ўсіх славянскіх народаў, трансфармаваўшыся ў цацку-вершніка. Але трэба адзначыць, што выява каня характэрна не толькі для славян, устойлівасць дадзенага сюжэта абумоўлена яго больш старажытнымі каранямі. У індаеўрапейскай міфалогіі конь быў атрыбутам шмат якіх боостваў.

Уплыў еўрапейскіх узораў народнага мастацтва на беларускае мастацтва пачынаецца з часоў узнікнення гарадоў. Моцна заходнія ўплывы праявіліся пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Рэчы Паспалітай. Пераймання народным мастацтвам заходнеўрапейскіх сюжэтаў спрыяла вядзенне гандлю. Месцам, дзе майстар мог пабачыць прывазны тавар, быў кірмаш. На беларускіх кірмашах, якія славіліся россыпамі цацак, майстры чэрпалі новыя сюжэты. Вобраз каня ў народнай цаццы "мадэрнізаваўся": з'явіліся выявы "круляў на конях" (каралёў на канях), калі ў цацкі-вершніка на галаве з'явілася карона, што характэрна для заходнееўрапейскай цацкі. З заходнім уплывам звязаны і такі сюжэт народнай цацкі, як "жаўнер." Аб гэтым сведчыць назва гэтай цацкі ("польскі салдат"), зафіксаваная збіральнікамі цацак у некаторых мясцовасцях Беларусі. Пасля другой сусветнай вайны, калі на Беларусі назіраецца росквіт саматужных рамёстваў, што было звязана з недахопам прамысловых тавараў, майстры вырабляюць цацкі ў выглядзе вершнікаў з аўтаматамі за плячыма і ў пілотках [4, с. 22]. Актывізацыя гандлёвых стасункаў спрыяла таму, што майстры-цацачнікі для павышэння попыту на сваю прадукцыю імкнуліся рабіць яе больш яркай, падобнай да прывазной. Так, даследчыкі да канца XIX ст. не знаходзяць у народнай цаццы беларусаў коней, запрэжаных у тройкі. Відавочна, што такі матыў народныя майстры перанялі ад сваіх усходніх суседзяў – рускіх.

Народнай цаццы беларусаў не была характэрна яркая расфарбоўка. Аднак у 20 – 30-я гг. XX ст. у в. Ракаў Валожынскага раёна народныя майстры рабілі цацкі, якія адрозніваліся яркай расфарбоўкай. Наіўна-рэалістычны накірунак народнага мастацтва праявіўся ў фігурках людзей, апранутых у адзенне па модзе таго часу. Беларускія майстры былі знаёмы з узорамі рускай цацкі з Дымкава, Раманава, Троіцка-Сергіеўскай Лаўры, багата размаляванымі і аздобленымі, імкнуліся паўтараць іх. У народнай цаццы беларусаў з'яўленне яркай расфарбоўкі было звязана і з пашырэннем штучных фарбавальнікаў, таму дадзеная тэндэнцыя ў цаццы звязана не толькі з перайманнем.

У беларускай народнай цаццы вельмі часта сустракаецца выява барана. Найчасцей гэта гліняныя свістулькі. У зборах Расійскага этнаграфічнага музея цацкі-выявы барана сустракаюцца ў калекцыях, сабраных А.К. Сербавым у Віцебскай губерні Полацкага павета ў 1914 г., Н.Н. Лебедзевым – у Мінскай губерні ў 1912 г., Е.Р. Раманавым – у Мінскай губерні ў 1908 г. і інш.

Паводле апісанняў у кнізе паступленняў большасць з цацак падобнага роду прадстаўляе гліняныя фігуркі памерам ад 6,5 да 10 см у даўжыню і ад 5,5 да 12 см у вышыню. Фігуркі казла падобны па стылістыцы, хаця сустракаюцца радзей. Але не так рэдка, каб гаварыць аб выцясненні адной выявай другой, хаця такое меркаванне існуе ў сучаснай літаратуры: "У народным мастацтве папулярна выява барана. Прычыны такой яго папулярнасці не вядомы. Магчыма, што выява казла, з часам, была проста выцеснена больш "цікавай" выявай барана дзякуючы яго выразным дэкаратыўным асаблівасцям – крутым рагам і курчавай воўне" [5, с. 10]. Калекцыя, сабраная А.К. Сержпутоўскім у 1929 г. у ваколіцах г. Гомеля, утрымлівае 18 цацак-жывёл, дзве з якіх – баранчыкі і адзін – казёл [6]. Астатнія прадстаўляюць іншых дзікіх і хатніх жывёл: каня, сабаку, карову, ваўка, лісу, пеўня, мядзведзя [7]. У калекцыі № 10616, перададзенай у Расійскі этнаграфічны музей з былога Музея народаў СССР, дзве цацкі-свістулькі ў выглядзе казла [8] і барана [9]. Паводле знешняга выгляду яны ідэнтычныя раней названым.

Абедзве жывёлы былі значнымі для сялянскай гаспадаркі, значную ролю яны адыгрывалі і ў абрадавай практыцы не толькі беларусаў, але і іншых народаў. таму ў народнай цаццы паралельна існуюць выявы і барана, і казла. Сімволіка дадзеных выяў характэрна для ўсіх славянскіх культур, таму тут мае месца не столькі ўзаемаўплыў, колькі роднасць дадзеных этнічных культур.

Такім чынам, для народнай цацкі беларусаў характэрны ўплывы некаторых рысаў і сюжэтаў народнай цацкі суседніх этнасаў. Усходнія ўплывы (руская, украінская цацка) праявіліся перш за ўсё ў колерным вырашэнні народнай цацкі, заходнія (польская цацка) – у сюжэтным вырашэнні беларускай народнай цацкі.

## Літаратура


1. Народная культура Беларусі: Энцыкл. давед. / Пад агульн. рэд. В.С. Цітова; Маст. І.І. Бокі, У.М. Жук. – Мн.: БелЭн, 2002. – 432 с.
2. Динцес Л.А. Русская глиняная игрушка: происхождение, путь исторического развития. – М.; Л.: Изд-во АН СССР, 1936. – 110 с.
3. Трыфаненкава М.А. Матыў змеяборства ва ўсходнеславянскай фальклорнай традыцыі: Генезіс. Семантыка / М.А. Трыфаненкава. – Мн.: БДУ, 2003. – 139 с.
4. Народные мастацкія рамёствы Беларусі / Уклад. Я.М. Сахута, маст. А.Ф. Кудрэвіч. – Мн.: Беларусь, 2001. – 168 с.: іл.
5. Сахута Я.М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. – Мн.: Беларусь, 1996 – 110 с.: ил.
6. Расійскі этнаграфічны музей – КП – 5052-5; 5052-6; 5052-7.
7. РЭМ – КП – 5052.
8. РЭМ – КП – 10966-34.
9. РЭМ – КП – 10966-35.